Караткевіч В. І., студ. гр. 403 ФТБКіСМ БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А., кандыдат філалагічных навук

**ШЛЯХІ ЎКАРАНЕННЯ ТРАДЫЦЫЙНАГА ПАХАВАЛЬНАГА АБРАДУ Ў ДЗЕЙНАСЦЬ СУЧАСНЫХ САЦЫЯЛЬНЫХ УСТАНОЎ**

Тэндэнцыя культурнай глабалізацыі асабліва абвастрае цікавасць да культурнай самабытнасці. Актуалізацыя багацейшай культурнай спадчыны нашага народа садзейнічае развіццю этнічнай самасвядомасці. Вельмі важнымі для культуры з'яўляюцца рытуалы пераходу, напрыклад  рытуал звязаны з надыходам смерці. Ён мае сэнс – «усталяванне новай ідэнтычнасці індывіда, фіксацыя яго новага статуса» [2, с. 232] у якасці духа–продка.

Даследванне сямейнай абраднасці, якая займае вызначальнае месца ў духоўнай спадчыне беларусаў, адкрывае перспектыву актуалізацыі абрадавага комплексу ва ўмовах ўрбанізаванага грамадства.

Для разумення сучаснага стану пахавальнага абраду ў гарадскім асяроддзі, мы зрабілі сінхронны аналіз пахавальных устаноў горада Мінска. Высветлілася, што ў Мінску дзейнічае звыш трыццаці прадпрыемстваў, якія абслугоўваюць патрэбы насельніцтва горада ў пахаваннях, памінальных абрадах і абрадавай атрыбутыцы. Да гэтага спісу далучаюцца медыцынскія, юрыдычныя ўстановы, установы грамадскага харчавання, фірмы, што спецыялізуюцца на вырабе помнікаў, агароджаў і дэкоры магіл.

Для патрэб пахавання сучасныя спецыялізаваныя арганізацыі прапануюць шыкоркі спектр паслуг, якія можна падзяліць на дзве групы адносна сувязі з традыцыйным пахавальным абрадам беларускага этнасу:

1) паслугі, што з'яўяліся традыцыйнымі ў народзе і бытуюць да нашых дзён (выраб помнікаў, драўляных і металічных крыжоў, дастаўка нябожчыка да месца пахавання, аднаўленне і  прыбіранне магіл, дапамога ў арганізацыі пахавання, царкоўнае адпяванне, капанне магілы і пахаванне на рушніках, вынас труны);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) паслугі, якія ў народзе не бытавалі, а сталі новаўвядзеннем сучаснага гарадскога грамадства (гандаль рытуальнай атрыбутыкай, прапанова аўтатранспарту, юрыдычныя паслугі, установы грамадскага харчавання для памінальнай трапезы, дамова з кіраўніцтвам моргаў, крэматорыяў, могілак, дапамога з атрыманнем матэрыяльнай дапамогі ад дзяржавы, змяшчэнне звестак у кнізе памяці, эксгумацыя, выраб штучных кветак, музычнае суправаджэнне пахавальнай працэсіі сучаснымі і класічнымі творамі, выраб металічных агароджаў, сталоў і лаў, фотапаслугі, бальзаміраванне, апранане і фарбаванне нябожчыка ў адпаведных установах).

Аднак існуе яшчэ адна група паслуг, якія шырока бытавалі ў народным асяродку, але сучасныя арганізацыі іх не прапануюць. Мы лічым, што яны ўяўляюць каштоўнасць не толькі як культурная спадчына беларусаў, але і могуць быць актуальнымі ў сучаснасці, разнастайніць абрады пахавання і памінак, зрабіўшы іх этнічна адметнымі.

Падрабязная фіксацыя пахавальнага абрадау дае нам магчымасць паспрабаваць наблізіцца да яго больш старажытнага варыянту.

Пахавальны рытуал – падвядзенне вынікаў жыцця чалавека, даніна ўдзячнасці за яго пажыццёвыя справы. Таму з самага моманту смерці і да аддацця цела зямлі кожнае абрадавае дзеянне прасякнута глыбокай павагай і любоўю да памёршага. Захоўваць памяць пра мёртвых і пасля хаўтур жывыя лічылі за свяшчэнны абавязак. Важнейшае значэнне ў кантэнсце любой абраднасці мае моўны матэрял. «Беларускія пахавальныя галашэнні ўяўляюць старажытнейшы жанравы пласт у сістэме беларускага фальклору» [3, с. 3].

Уменне аплакваць нябожчыкаў патрабавалі звычаі нашых продкаў. Але не ўсе людзі могуць плакаць і прычытаць, перажываюць, а выказаць не могуць. «Асабліва паважаюць і шануюць тую жанчыну, якая ўмее добра галасіць над памёршым» [3, с. 8], таму ў народзе з’явіліся прафесійныя плакальшчыцы. Прасілі паплакаць спрактыкаваную ў гэтым жанчыну, што ў наш час здараецца вельмі рэдка [1, 2, 3, 4] Галашэнні маюць падставу быць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адноўленымі і ўведзенымі ў сучасныя пахавальны і памінальны абрады. Даследчыкі вылучаюць 7 цыклаў пахавальных галашэнняў адпаведна этапам абраду [3, с. 181].

Акрэслім некаторыя абрадавыя дзеянні і атрыбуты, якія б маглі быць аднοўлены і прадстаўлены ў асартыменце арганізацый, што займаюцца пахаваннем. Варта, каб у каталогу яны суправаджаліся фотаздымкамі, тлумачэннямі і метадычнымі указаннямі. Сярод абрадавых атрыбутаў – рушнік з адпаведным арнаментам (пахавальнай сімволікай), пасмяротнае адзенне. Да вырабу іх па народнай тэхналогіі – уручную – могуць прыцягвацца майстры, што валодаюць адпаведным навыкам. Сярод атрыбутыкі таксама могуць быць прадстаўлены нарыхтоўкі з елкі, аеру, зёлак. Да атрыбутаў пахавання можна аднесці рытуальныя стравы памінальнай вячэры ці «хаўтур». У меню сучаснага памінальнага стала могуць быць уключаны хлеб, тры лыжкі кануну, тры чаркі гарэлкі, куцця, бліны, боршч, зацірка, рыба, яечня, каўбасы, тушаная купуста, лапша, пірагі, засмажаная бульба, галушкі, жур, паляніца.

Родным памерлага могуць быць прадстаўлены метадычныя матэрыялы, у якіх будуць прапанаваны да ажыццяўлення на пахаванні забытыя абрадавыя дзеянні. Сярод іх мы прапануем наступныя: унясенне ў хату хлеба-солі: «нябожчык з хаты – хлеб і соль у хату» [3, с. 51]; абсыпанне зернем хаты, двара, прысутных на пахаванні, транспарту, на якім павязуць на могілкі; звязванне дзвярэй (адразу ж пасля вынасу нябожчыка за парог дзверы хаты зачыняюць і навязваюць на іх чырвоны пояс ці ручнік); шэсце пахавальнай працэсіі (па магчымасці можна арганізаваць шэсце працэсіі да могілак у вызначаным традыцыяй парадку); скліканне духаў продкаў на памінальную вячэру (пасля пахавання жанчыны ідуць у хату, запальваюць свечку і нібыта склікаюць «дзядоў» спецыяльным рэчытатыўным творам ці песняй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практычнае выкарыстанне і развіццё прыведзеных прапаноў дапаможа зрабіць пахавальны абрад этнічна самабытным і паўней захоўваць культурную спадчыну народа.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / Рэд. кал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш.; Укладанне тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У. А. Васілевіча; Артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т. Б. Варфаламеевай. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.

2. Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г. Этнология – М.: Академия, 2000. – 304 с.

3. Сысоў У. М. Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – 182 с.

4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 5. Цэнтральная беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Вышэйшая школа, 2010. – 847 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ